ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 26 (586) | Субота, 20 кастрычніка 1984 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## МАБІЛІЗУЮЧАЕ СЛОВА ПАРТЫІ

**67-ы** раз сустрэне савецкі народ гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая паклала пачатак новай эры ў гісторыі чалавецтва. Як заўсёды, напярэдадні слаўнага свята, мы у думках вяртаемся назад, каб з вышыні сённяшняга дня ацаніць дасягнутае першай у свеце сацыялістычнай краіны за шэсць дзесяцігоддзяў, каб намеціць яшчэ больш адказныя задачы на будучае.

Палымяныя заклікі ЦК КПСС да 67-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, якія апублікаваны ў друку, атрымалі гарачую падтрымку і адабрэнне савецкіх людзей. У гэтыя дні асабліва адчувальны іх патрыятычны энтузіязм. Яны поўныя рашучасці паспяхова ажыццявіць рашэнні XXVI з'езда КПСС, планы адзінаццатай пяцігодкі. Да новых здзяйсненняў упэўнена вядзе іх КПСС:

**— Няхай жыве Камуністычная партыя Савецкага Саюза!**

**Непахіснае адзінства партыі і народа, вернасць запаветам вялікага Леніна — залог усіх нашых перамог!**

З году ў год у нашай краіне ўсямерна развіваюцца ўсе галіны прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту, будаўніцтва, забяспечваецца новы ўздым савецкай навукі і тэхнікі, адукацыі і аховы здароўя, матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа. Усё гэта дасягнута самаадданай працай савецкіх людзей.

Каб паспяхова ісці наперад, дабівацца новых вынікаў у камуністычным будаўніцтве ЦК КПСС заклікае:

**Працоўныя Савецкага Саюза! Шырэй разгортвайце сацыялістычнае спаборніцтва за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці прадукцыі!**

**— Паскарайце навукова-тэхнічны прагрэс! Настойліва ўкараняйце ў вытворчасць дасягненні навукі, тэхнікі і перадавога вопыту!**

ЦК КПСС разглядае задачу далейшага паляпшэння работы з моладдзю як найважнейшую партыйную, дзяржаўную і агульнанародную справу. Наша партыя ганарыцца здзяйсненнямі Ленінскага камсамола, які ўвасабляе лепшыя рысы маладога пакалення краіны. Па закліку партыі моладзь з энтузіязмам бярэцца за рашэнне найбольш важных для краіны задач. Важкі яе ўклад у будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі, у асваенне багаццяў Сібіры, Далёкага Усходу, Крайняй Поўначы. Таму з асаблівым пачуццём успрыняла савецкая моладзь радкі Заклікаў:

**— Няхай жыве Ленінскі камсамол — баявы памочнік і надзейны рэзерв Камуністычнай партыі, перадавы атрад маладых будаўнікоў камунізму!**

**— Юнакі і дзяўчаты! Нястомна авалодвайце ведамі, культурай, прафесіянальным майстэрствам! Прымнажайце рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі Камуністычнай партыі і савецкага народа!**

Сувязь часоў, сувязь пакаленняў непарыўная. Моладзь 70-х гадоў трымае раўненне на сваіх старэйшых таварышаў, на ветэранаў партыі і Вялікай Айчыннай вайны, вучыцца ў іх вернасці ленінскім запаветам, адданасці справе. Юнакі і дзяўчаты з гонарам нясуць у гэтыя дні працоўную вахту па дастойнай сустрэчы слаўнай даты — 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Яны пішуць летапіс народнай славы савецкага народа: збіраюць успаміны былых воінаў, партызан, падпольшчыкаў, якія не шкадуючы свайго жыцця набліжалі светлы дзень перамогі. Бязмежная ўдзячнасць выказана абаронцам Радзімы ў радках Заклікаў:

**— Слава бальшавікам-ленінцам, ветэранам партыі, героям Кастрычніка, усім бясстрашным барацьбітам за гонар, свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!**

**Няхай вечна жыве ў памяці народнай бяспрыкладны подзвіг савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў, працаўнікоў тылу, атрымаўшых сусветна-гістарычную перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне!**

У краіне пачалося ажыццяўленне рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. Ад работнікаў народнай асветы патрабуецца памножыць намаганні па ўдасканальванню навучання і камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення. ЦК КПСС заклікае выхоўваць сапраўдных патрыётаў і інтэрнацыяналістаў, прывіваць школьнікам любоў да грамадска-карыснай працы.

Важкі ўклад у вырашэнне агульнанародных задач заклікаsuccessfully ўносіць савецкія вучоныя, дзеячы літаратуры і мастацтва, работнікі культуры. ЦК КПСС падкрэслівае тыя задачы, якія стаяць перад работнікамі ідэалагічнага фронту. Іх абавязак — раскрываць дасягненні грамадства развітога сацыялізму, выкрываць падрыўную імперыялістычную прапаганду.

Няма мэты больш высакароднай і адказнай, чым захаванне трывалага міру на планеце. Савецкі народ, які страціў у гады другой сусветнай вайны 20 мільёнаў жыццяў, будзе рабіць усё для таго, каб не дапусціць развязвання новага ядзернага пажару. Савецкія людзі выражаюць сваю гарачую падтрымку мудрай ленінскай унутранай і міжнароднай палітыцы КПСС.

Мы з упэўненасцю глядзім у заўтрашні дзень, і кожны з нас не шкадуе намаганняў, каб і далей памнажаць дабрабыт Радзімы, умацоўваць мір. На гэта нас клічуць словы Заклікаў:

**— Пад сцягам Леніна, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі — наперад, да новых перамог у камуністычным будаўніцтве!**

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**24 кастрычніка ў актавай зале адбудзецца VII агульнаўніверсітэцкая справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя. На парадак дня выносяцца наступныя пытанні:**

**1. Справаздача аб рабоце прафсаюзнага камітэта.**
**(дакладчык — старшыня прафкома М. Н. Мурашка).**

**2. Справаздача рэвізійнай камісіі.**
**(дакладчык — старшыня рэвізійнай камісіі А. А Скорава).**

**3. Выбары новага саставу прафсаюзнага камітэта.**

**4. Выбары новага саставу рэвізійнай камісіі.**

**5. Выбары дэлегатаў на XVII абласную прафсаюзную канферэнцыю.**

**Рэгістрацыя дэлегатаў канферэнцыі з 10 гадзін 30 мінут.**

**Пачатак работы канферэнцыі ў 11 гадзін.**

**Прафком.**

## ПА ПРАБЛЕМАХ КАМУНІСТЫЧНАГА СВЕТАПОГЛЯДУ

Учора завяршыла сваю работу **абласная** навукова-практычная канферэнцыя «Праблемы фарміравання **камуністычнага светапогляду** ў працэсе выкладання геаграфічных дысцыплін і прапаганды геаграфічных ведаў». Яна праходзіла ў абласным Інстытуце ўдасканальвання настаўнікаў і была падрыхтавана Гомельскім аддзелам Геаграфічнага таварыства БССР, абласным саветам пед-таварыства рэспублікі, абласной арганізацыяй таварыства «Веды» і ГДУ. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел вучоныя вобласці, Мінска, Ленінграда, Кішынёва, Калінінграда, Брянска, навуковыя і педагагічныя работнікі.

Спачатку адбылося пленарнае пасяджэнне канферэнцыі. Затым сваю работу яна працягвала па секцыях. Сярод іншых на канферэнцыі былі заслуханы даклады выкладчыкаў нашага універсітэта дацэнтаў А. А. Малахава, Г. К. Котава, прафесара Б. П. Савіцкага, кандыдатаў біялагічных навук І. Ф. Расашка, В. І. Талкачова, Я. Я. Падутава, асістэнта Д. А. Басавай.

Канферэнцыя прыняла адпаведныя рэкамендацыі.

## ВЫСТУПІЛІ ВУЧОНЫЯ

У новым навучальным годзе ў сістэме палітасветы пачалі актыўную работу лектары абласной арганізацыі таварыства «Веды». Група іх днямі выязджала ў гарады Рэчыцу і Светлагорск. Цыкл тэматычных лекцый па эканоміцы адкрыў дацэнт кафедры тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі ГДУ Г. К. Котаў. Тэма яго лекцыі — «Эканоміка СССР — адзіны народнагаспадарчы комплекс».

Загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі прафесар, член-карэспандэнт АПН СССР І. Ф. Харламаў у сваіх лекцыях асвятліў пытанні рэалізацыі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы.

У Рэчыцы лекцыі былі прачытаны для работнікаў філіяла абутковай фабрыкі «Праца», магазіна № 18, метызнага завода; у Светлагорску — для рабочых і служачых жалезабетонных вырабаў і канструкцый, вышкамантажнай канторы вытворчага аб'яднання «Беларусьнафта», будаўнічага ўпраўлення.

Лекцыі аб школьнай рэформе з вялікай увагай былі праслуханы педагогамі, бацькамі вучняў і навучэнцаў прафтэхвучылішчаў.

(Наш кар.)

## У ПАРТКОМЕ

Пазаўчора адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта. Абмеркавана пытанне аб рабоце з камуністамі-студэнтамі на гісторыка-філалагічным, біялагічным і эканамічным факультэтах. Заслухана інфармацыя сакратароў партбюро В. Ф. Маслюкова з гістфіла і В. А. Хількевіча з біяфака. Па выніках праверкі выступілі члены парткома Л. І. Бурава, У. П. Балога, Я. А. Семянчук, член КПСС В. А. Асіпенка.

На пасяджэнні парткома адзначалася, што на названых факультэтах амаль усе студэнты-камуністы маюць пастаянныя і часовыя даручэнні, добрасумленна спраўляюцца з імі. Многія члены і кандыдаты ў члены КПСС паспяхова вучацца. Разам з тым называліся прозвішчы камуністаў, на якіх яшчэ нельга раўняцца.

Партком прыняў пастанову па далейшаму паляпшэнню работы са студэнтамі-камуністамі.

Рэкамендавана перыядычна заслухоўваць на пасяджэннях бюро справаздачы студэнтаў-камуністаў, узмацніць сярод іх індывідуальную работу.

На пасяджэнні парткома разгледжаны кадравыя і некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, кафедра батанікі і фізіялогіі раслін горача віншуюць кандыдата біялагічных навук БАРАВІКОВУ Ганну Міхайлаўну з выпадку прысваення ёй ВАКам вучонага звання дацэнт.**

## АБАВЯЗАК НАРОДНЫХ ДАЗОРНЫХ

Савецкае грамадства ўступіла ў новы этап эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Сучаснае жыццё пастаянна прад'яўляе павышаныя патрабаванні да ўсіх звенняў кіравання народнай гаспадаркай, эканомікай і культурным будаўніцтвам. Каб палепшыць наш гаспадарчы механізм, узняць на новы, больш высокі ўзровень дабрабыт народа, усе савецкія людзі павінны працаваць свядома і з творчай ініцыятывай.

Важную ролю ў рэалізацыі гэтых задач адыгрываюць народныя кантралёры. З'яўляючыся неад'емнай часткай савецкай дэмакратыі, яны ўносяць важкі ўклад у дасягненні нашай сацыялістычнай эканомікі. У групах і пастах народных кантралёраў цяпер актыўна працуе 10 мільёнаў чалавек.

Для далейшага паляпшэння дзейнасці дазорных важнае значэнне мела Усесаюзная нарада народных кантралёраў, якая адбылася ў Маскве у пачатку бягучага месяца. На ёй абмеркаваны вынікі дзейнасці органаў народнага кантролю, вызначаны важнейшыя напрамкі ў святле патрабаванняў XXVI з'езда КПСС і наступных Пленумаў Цэнтральнага Камітэта партыі. З яркай і глыбокай прамовай выступіў на нарадзе Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР т. К. У. Чарненка. У прыватнасці, ён сказаў: «Трэба, каб народным кантралёрам усведамляў сябе кожны — заўважце, кожны — савецкі чалавек, каб ён мысліў і дзейнічаў адпаведна гэтай высокай і грамадзянскай пасадзе».

У нашым універсітэце ў групах народнага кантролю налічваецца больш 90 дазорных. Большасць з іх з'яўляюцца сапраўднымі актывістамі. Яны ажыццяўляюць пастаянны кантроль за выкананнем рашэнняў партыі і ўрада па вышэйшай школе, укараненнем дасягненняў навукі ў практыку, эканоміяй матэрыяльных каштоўнасцей. Аднак, у гэтым напрамку ў нас зроблена яшчэ не ўсё. Праверкі, якія праводзіліся ў ГДУ Рэспубліканскім камітэтам народнага кантролю, камісіямі Мінвуза БССР, выявілі істотныя недахопы ў выкарыстанні каштоўнага абсталявання для вучэбных і навуковых мэт, маруднае ўкараненне вынікаў навуковых распрацовак у вытворчасць, нізкі эканамічны эфект ад затрачаных на навуковыя даследаванні сродкаў. Адсюль узнікае пярвейшая задача народных кантралёраў універсітэта — дзейнічаць больш смела і рашуча, быць строгімі і патрабавальнымі да тых работнікаў, якія дапускаюць безгаспадарчасць і марнатраўства, парушаюць выканаўчую і працоўную дысцыпліну, выкрываць і ўхіляць усё тое, што перашкаджае нашаму руху наперад.

**У. АРЭШЧАНКА,**
**намеснік сакратара парткома, старшыня галаўной групы народнага кантролю ГДУ.**

# ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК — ЭКЗАМЕН НА СТАЛАСЦЬ

★ ★

## ВОПЫТ АБАГУЛІЦЬ І РАСПАЎСЮДЖВАЦЬ

Нядзеля, звычайна, выхадны дзень і для выкладчыкаў, і для студэнтаў. Аднак, 14 кастрычніка ў нашым універсітэце гэта было не так. Ужо да дзесяці гадзін раніцы ў актавай зале сабраліся сотні людзей. Сярод іх — прадстаўнікі рэктарата і дэканатаў, парткома і камітэта ЛКСМБ ГДУ, куратары, члены атэстацыйных камісій.

**Упершыню ва універсітэце ў мінулую нядзелю прайшоў адзіны дзень грамадска-палітычнай атэстацыі па Ленінскаму заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!». Атэстацыі папярэднічала нарада членаў грамадска-атэстацыйных камісій. Уступным словам яе адкрыў сакратар камітэта ЛКСМБ універсітэта А. Кусянкоў.**

**Аб задачах атэстацыі па Ленінскаму заліку ў сваім выступленні гаварыла першы сакратар Цэнтральнага райкома камсамола, выпускніца фізічнага факультэта нашага універсітэта Таццяна Любезная.**

**Аб ініцыятарах правядзення адзінага дня грамадска-палітычнай атэстацыі па Ленінскаму заліку — камсамольцах Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава і іх паслядоўніках расказаў удзельнікам нарады намеснік камандзіра Рэспубліканскага штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў Леанід Гайдукевіч. Ён падкрэсліў, што камсамольская арганізацыя ГДУ першая на Гомельшчыне падтрымала гэту каштоўную ініцыятыву. Як вядома, грамадска-палітычная атэстацыя — своеасаблівая масавая справаздача не толькі аб узроўні паспяховасці і гатоўнасці праверыць сябе на практыцы па абранай прафесіі, але і аб тым, якую жыццёвую пазіцыю займае кожны камсамолец, як за гады вучобы сфарміраваўся яго кругагляд, наколькі ён вырас ва ўсіх аспектах чалавечай асобы, будучага будаўніка камуністычнага грамадства.**

**Перад удзельнікамі нарады выступіў і пажадаў ім плённай працы ў правядзенні грамадска-палітычнай атэстацыі сакратар парткома М. І. Старавойтаў.**

**З адзінаццаці гадзін у аўдыторыях усіх вучэбных карпусоў пачалася грамадска-палітычная атэстацыя. Разам з ужо названымі вышэй камсамольскімі работнікамі ў ёй прынялі ўдзел загадчык аддзела АК ЛКСМБ Тамара Кабанава, першы сакратар гарадскога камітэта камсамола Яўген Астракоў, другі сакратар Цэнтральнага камітэта ЛКСМБ Іван Бордак, сакратар гэтага ж райкома камсамола Надзежда Падзорава, інструктар Рэспубліканскага штаба СБА Яраслаў Буяльскі.**

Ход атэстацыі цяпер вывучаецца і яго вынікі будуць падведзены некалькі пазней з мэтай выяўлення лепшага вопыту, яго замацавання і пашырэння ў будучым.

Натуральна, важнае палітычнае мерапрыемства праходзіла ў акадэмічных групах далёка не аднолькава. Было шмат карыснага, павучальнага, здараліся і істотныя недахопы. Сведчаннем гэтаму — змешчаныя ніжэй публікацыі. Аднак яны далёка не поўныя і не вычарпальныя. Таму рэдакцыя звяртаецца да студэнтаў універсітэта з прапановай прадоўжыць размову аб першым адзіным дні грамадска-палітычнай атэстацыі на старонках нашай газеты. Гэта пойдзе на карысць агульнай важнай справе.

Пасля грамадска-палітычнай атэстацыі адбыліся справаздачы і выбары групкамсоргаў.

**У спартыўнай зале з вялікай цікавасцю прайшлі матчы па міні-футболу, а вечарам у актавай зале з канцэртам мастацкай самадзейнасці выступіла агітбрыгада ГДУ.**




На здымку: грамадска-палітычная атэстацыя ў групе Ф-22 фізічнага факультэта

## АРГАНІЗАВАНА, ПА-ДЗЕЛАВОМУ

18 ВНУ нашай краіны падтрымалі пачын: праводзіць Ленінскі залік «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» у адзін дзень усеагульнай атэстацыі камсамольцаў. Адметнасцю новаўвядзення з'яўляецца таксама і тое, што ў адзіны дзень грамадска-палітычнай атэстацыі праводзяцца мерапрыемствы, якія надаюць гэтаму дню атмасферу ўсеагульнага свята: выступленне студэнцкіх калектываў мастацкай самадзейнасці, спартыўныя спаборніцтвы і г. д. Такі вопыт правядзення Ленінскага заліку апраўдаў сябе ў вышэйшых навучальных установах краіны, і таму быў рэкамендаваны да распаўсюджання ў іншых камсамольскіх арганізацыях.

Паспяхова прайшла ў мінулую нядзелю грамадска-палітычная атэстацыя на эканамічным факультэце. Усе студэнты былі атэставаны, члены атэстацыйных камісій сур'ёзна і прынцыпова аднесліся да сваіх абавязкаў.

Прыемна адзначыць, што большасць будучых эканамістаў добра вучыцца, актыўна займаецца грамадскай работай. Ёсць, на жаль, і такія, якія ўхіляюцца ад грамадска-карыснай працы, ніводнага разу не былі ў будатрадзе, не ўдзельнічаюць у факультэцкіх мерапрыемствах. Такія абыякавыя адносіны камсамольцаў да агульных спраў эканомфака і універсітэта ў цэлым трэба выкараняць. Грамадска-палітычная атэстацыя стала ўсебаковай праверкай для студэнтаў на грамадзянскую сталасць, дзелавітасць і адказнасць перад старэйшымі таварышамі.

**Ірына НЕШЫК,**
**старшыня прэс-цэнтра эканамічнага факультэта.**

## АДТЭРМІНОЎКА БЕЗ ПАДСТАЎ

Актыўна і на высокім узроўні прайшоў адзіны дзень грамадска-палітычнай атэстацыі па Ленінскаму заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» у многіх акадэмічных групах матэматычнага факультэта. Аднак гэтага не скажаш пра гр. М-43 (куратар Ю. У. Малінкоўскі). На стану на 14 кастрычніка дзевяць студэнтаў мелі акадэмічную запазычанасць, што давала повад для сур'ёзнай і патрабавальнай размовы пры атэстацыі.

Праўда, у групе было аб чым гаварыць і са станоўчага боку. Яе студэнцкі атрад «Алеся» мінулым летам плённа папрацаваў у саўгасе «Судкова» Хойніцкага раёна. Чацвёра студэнтаў групы ў саставе універсітэцкага атрада правялі працоўны семестр у Якуціі, дзе таксама паспяхова справіліся з вытворчай праграмай. У групе шмат актыўных спартсменаў. Аднак нічым нельга кампенсаваць і апраўдаць нізкі ўзровень паспяховасці. Падводзяць групу Ніна Пінчук, Люда Палын, Уладзімір Дзегавец, Лена Надтачый і некаторыя іншыя камсамольцы. На здзіўленне, на грамадска-палітычную атэстацыю з'явілася ўсяго толькі адзінаццаць чалавек, а з тых, хто не ліквідаваў запазычанасць, — толькі адзін. Гэта Уладзімір Макарэвіч, які адзіны не быў атэставаны з усіх прысутных. Прычына вядомая: перш за ўсё яму патрэбна ліквідаваць запазычанасць.

Няяўка іншых студэнтаў на атэстацыю, за выключэннем двух—трох чалавек, не павінна прайсці бясследна. Менавіта з-за гэтага нельга было правесці ў групе справаздачу і выбары камсорга. На дзень атэстацыі яна засталася без свайго важака. Былы камсорг Н. Васільчанка пасля размеркавання па спецыялізацыях цяпер займаецца ў групе М-42.

**Пры грамадска-палітычнай атэстацыі некаторым студэнтам былі зроблены справядлівыя нараканні за слабую арыентацыю ў палітычным і культурным жыцці краіны і г. д. Словам, грамадска-палітычная атэстацыя ў групе М-43 матэматычнага факультэта з'явілася тым урокам, з якога трэба зрабіць належныя вывады.**

**(Наш кар.).**

## КРЫТЭРЫЙ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ

Ва ўдасканальванні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнцкай моладзі вялікую ролю адыгрывае Ленінскі залік. Ён дазваляе арганічна спалучаць тэарэтычныя веды з грамадска-палітычнай практыкай, з жыццём пярвічнай камсамольскай арганізацыі. Ленінскі залік стаў вядучай формай індывідуальнай работы з камсамольцамі ў вучэбнай групе.

На гэты раз Ленінскі залік прайшоў адначасова ва ўсіх акадэмічных групах універсітэта. Кожны студэнт прыйшоў на залік з асабістым комплексным планам, які з'яўляецца «палітычным тварам» камсамольца. На працягу навучальнага года на камсамольскіх сходах, пасяджэннях камсамольскага бюро груп сістэматычна заслухоўваліся справаздачы асобных студэнтаў аб іх рабоце па выкананню ўзятых абавязацельстваў.

У час грамадска-палітычнай атэстацыі вялася прынцыповая размова аб шляхах павышэння паспяховасці студэнтаў, павышэння іх сацыяльнай актыўнасці, умацавання дысцыпліны. Ленінскі залік праходзіў з удзелам выкладчыкаў-грамадазнаўцаў, і ў час яго разгледзеліся пытанні павышэння эфектыўнасці камуністычнага выхавання студэнтаў.

На біялагічным факультэце Ленінскі залік праходзіў арганізавана, у творчай абстаноўцы.

Крытэрый эфектыўнасці Ленінскага заліку — сацыяльная актыўнасць студэнтаў. Гэта знаходзіць канкрэтнае праяўленне у вучэбнай, навуковай і грамадска-палітычнай дзейнасці камсамольцаў.

**А. АУДАШОВА,**
**намеснік сакратара камсамольскага бюро біяфака.**



На высокім ідэйна-палітычным узроўні прайшла грамадска-палітычная атэстацыя ў чацвёртакурснікаў гістарычнага аддзялення. На ёй прысутнічалі сакратар парткома ГДУ, М. І. Старавойтаў і намеснік камандзіра Рэспубліканскага штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў Леанід Гайдукевіч.

**НА ЗДЫМКАХ: 1. За работай члены атэстацыйнай камісіі в. а. загадчыка кафедры ўсеагульнай гісторыі Р. Р. Лазько і асістэнт гэтай кафедры І. П. Бязручка. 2. У ліку першых камсамольцаў была атэставана студэнтка Таццяна Даўгун (на пярэднім плане).**

Фота **У. Чысціка.**



